# АЛЯКСАНДР ІВАНАВІЧ ЛАКОТКА

## (Да 60-годдзя з дня нараджэння)



25 студзеня 2015 года спаўняецца 60 гадоў выдатнаму беларускаму вучонаму, дырэктару Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, акадэміку НАН Беларусі, доктару архітэктуры і доктару гістарычных навук, прафесару Аляксандру Іванавічу Лакотку.

А. І. Лакотка нарадзіўся ў вёсцы Кузьмічы Дзятлаўскага раёна Гродзенскай вобласці ў сям'і настаўнікаў. У 1972 годзе паступіў у Беларускі політэхнічны інстытут на архітэктурны факультэт. Пасля заканчэння інстытута кіраваў рабочай групай па стварэнні Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту, а потым працаваў намеснікам дырэктара па навуковай рабоце гэтага музея. У 1993 годзе ён абараняе доктарскую дысертацыю па этналогіі і яму прысуджаецца навуковая ступень доктара гістарычных навук, у 1995 годзе А. І. Лакотка пераходзіць на працу ў Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі на пасаду загадчыка аддзела архітэктуры. У 1997 годзе яго прызначаюць намеснікам дырэктара па навуковай рабоце, у 2001 годзе ён абараняе доктарскую дысертацыю па тэорыі і гісторыі архітэктуры, рэстаўрацыі і рэканструкцыі будынкаў і збудаванняў і яму прысуджаецца навуковая ступень доктара архітэктуры. У красавіку 2004 года яго выбіраюць членам-карэспандэнтам Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, а ў верасні гэтага года Аляксандр Іванавіч Лакотка прызначаецца дырэктарам Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы. З верасня 2012 года ён працуе дырэктарам Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. У лістападзе 2014 года яго выбіраюць акадэмікам НАН Беларусі.

Аляксандр Іванавіч Лакотка – буйны даследчык культуры. Ён аўтар звыш 250 навуковых прац, у тым ліку 18 манаграфій, сярод якіх найбольш значнымі з'яўляюцца: «Беларускае народнае дойлідства» (1991), «Сілуэты старога Мінска. Нарысы драўлянай архітэктуры» (1991), «Бераг вандраванняў, ці адкуль у Беларусі мячэці» (1994), «Беларусы». Т. 2: «Дойлідства» (1997), «Нацыянальныя рысы беларускай архітэктуры» (1999), «Гістарычна-культурныя рэгіёны Беларусі» (2002), «Драўлянае сакральна-манументальнае дойлідства Беларусі» (2003), «Архітэктурная спадчына Беларусі» (2004), «Гістарычна-культурныя ландшафты Беларусі» (2006), «Архітэктура Беларусі ў еўрапейскім і сусветным кантэксце» (2012) і інш.

А. І. Лакотка распрацаваў новы комплексны метадалагічны падыход, які грунтуецца на спалучэнні гістарычна-параўнальнага, архітэктуразнаўчых і мастацтвазнаўчых метадаў і дазваляе выявіць этнічныя рысы і рэгіянальныя асаблівасці беларускай архітэктуры. Таленавіты вучоны стварыў новую навуковую канцэпцыю гістарычнага феномена беларускай архітэктуры як своеасаблівага сінтэзу ўсходнееўрапейскіх і заходнееўрапейскіх традыцый дойлідства, раскрыў ролю ўсходнееўрапейскіх і заходнееўрапейскіх традыцый у эвалюцыі беларускіх гарадоў, ахарактарызаваў гістарычныя працэсы зменлівасці тыпаў паселішчаў. А. І. Лакотка вылучыў і сістэматызаваў агульныя і рэгіянальныя асаблівасці вясковага жылля беларусаў, прааналізаваў яго этнічныя рысы, распрацаваў тыпалагічную класіфікацыю ўсіх кампанентаў вясковага жылога комплексу, якая ўлічвае не толькі канструктыўныя асаблівасці, але і сацыяльна-эканамічныя і куль-

турна-гістарычныя фактары, даследаваў уплыў ландшафтных умоў на фарміраванне жылога асяроддзя, узаемасувязь вясковага і традыцыйнага гарадскога жылля, выявіў прычыны рэгіянальных адрозненняў беларускага сакральнага дойлідства, да якіх адносяцца адчуванне маштабу і суразмернасці ў асяроддзі (нізіннае і ўзгорыстае), традыцыйнае разуменне суадносін гармоніі і памераў, светапоглядныя ўяўленні аб прыгажосці той ці іншай формы, кампазіцыі (ярусная, восевай). У сваіх працах А. І. Лакотка яскрава паказаў, што беларускае дойлідства з'яўляецца адной з выразных культурных адзнак беларускага этнасу.

Навуковыя працы Аляксандра Іванавіча Лакоткі маюць грунтоўную базу крыніц. Пад яго кіраўніцтвам і з непасрэдным асабістым удзелам праведзена шмат экспедыцый, абследаваны сотні сельскіх паселішчаў, дваццаць восем гарадоў, узята на ўлік некалькі тысяч помнікаў беларускага дойлідства.

Атрыманыя вынікі навуковых даследаванняў А. І. Лакоткі маюць важнае тэарэтычнае і практычнае значэнне. Яны адкрываюць новыя гарызонты для пошуку сучасных форм мастацка-стылёвай выразнасці планіроўкі і забудовы паселішчаў, для дэталёвага вывучэння рэгіянальнай і лакальнай спецыфікі беларускага дойлідства, для рэстаўрацыі архітэктурных помнікаў. Гэтыя вынікі адзначаны прэміяй «За духоўнае адраджэнне» (2009), а таксама Прэміяй НАН Беларусі (1999).

Як кіраўнік А. І. Лакотка надае важнае значэнне падрыхтоўцы і выданню калектыўных навуковых прац «Гарады і вёскі Беларусі», «Архітэктура Беларусі: Нарысы эвалюцыі ва ўсходнеславянскім і еўрапейскім кантэксце», «Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі». Шматтомная калектыўная праца «Гарады і вёскі Беларусі» будзе садзейнічаць папулярызацыі культурнай спадчыны нашай краіны, узбагачэнню вучэбнай і выхаваўчай работы вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь, прагназаванню развіцця паселішчаў. Другая шматтомная калектыўная праца «Архітэктура Беларусі: Нарысы эвалюцыі ва ўсходнеславянскім і еўрапейскім кантэксце» паспрыяе рэстаўрацыі помнікаў архітэктуры, больш шырокаму выкарыстанню архітэктурных традыцый у сучасную эпоху. Штогадовае выданне «Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі» мае істотнае значэнне для павышэння кваліфікацыі супрацоўнікаў, падрыхтоўкі навуковых кадраў (уключана ў пералік выданняў ВАК Беларусі).

А. І. Лакотка шмат робіць для практычнага прымянення вынікаў навуковых даследаванняў. Пад яго кіраўніцтвам распрацаваны Генеральны план Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту, праект сектара «Цэнтральная Беларусь» гэтага музея, праекты многіх сядзіб, арганізавана перавозка, размяшчэнне і рэстаўрацыя грамадскіх, культурных, жылых і гаспадарчых пабудоў. Ён з'яўляецца ініцыятарам стварэння музеяў у г. п. Глуша Бабруйскага раёна Магілёўскай вобласці і ў вёсцы Моталь Іванавіцкага раёна Брэсцкай вобласці.

Вялікую ўвагу Аляксандр Іванавіч Лакотка надае падрыхтоўцы кадраў вышэйшай кваліфікацыі. З 1990 года ён выкладае ў некалькіх вышэйшых навучальных установах – Беларускім дзяржаўным універсітэце, Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя Максіма Танка, Беларускім нацыянальным тэхнічным універсітэце. Ім распрацаваны курсы лекцый «Мастацкая культура Беларусі», «Гісторыя архітэктуры Беларусі», «Беларускае народнае дойлідства», «Ахова і рэстаўрацыя архітэктурнай спадчыны». Ён падрыхтаваў пяць дактароў і пяць кандыдатаў навук, з'яўляецца старшынёй савета па абароне дысертацый па мастацтвазнаўству. За паспяховую падрыхтоўку кадраў вышэйшай кваліфікацыі А. І. Лакотку ў 2003 годзе прысвоена вучонае званне прафесара.

Плённую навуковую і педагагічную работу А.І.Лакотка паспяхова спалучае з актыўнай грамадскай дзейнасцю. Ён з'яўляецца членам Еўрапейскага савета па культуры, членам Міжнароднай арганізацыі па народнай творчасці ЮНЕСКА, членам Навукова-метадычнага савета па праблемах аховы і рэстаўрацыі гістарычна-культурнай спадчыны, членам Саюза архітэктараў Беларусі, акадэмікам Міжнароднай славянскай акадэміі па пытаннях культуры, адукацыі і навукі, членам-карэспандэнтам Міжнароднай акадэміі архітэктуры.

Калегі па творчай працы шчыра віншуюць Аляксандра Іванавіча Лакотку з 60-гадовым юбілеем і жадаюць яму здзяйснення ўсіх планаў і задум.

*М. Ф. Піліпенка*